**Кузняцоў** Юрый Аляксеевіч // Памяць. Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — С. 465—466.

## КУЗНЯЦОЎ ЮРЫЙ АЛЯКСЕЕВІЧ

Нарадзіўся 27 верасня 1964 г. у пас. Бел-ДРЭС Аршанскага раёна Віцебскай вобл. Беларус. Член ВЛКСМ. Маці, Тамара Цімафееўна, працуе ізаліроўшчыцай на Лукомскай ДРЭС. У 1981 г. скончыў сярэднюю школу № 2 г. Навалукомля, у 1982 г. ПТВ № 83 па спецыяльнасці электразваршчык. У верасні 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію Чашніцкім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы Ю. А. Кузняцоў загінуў 14 лістапада 1983 г. Пахаваны ў в. Старыя Лаўкі Чашніцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

*...13 лістапада 1983 г. баявая група знаходзілася ў засадзе. Увечары быў выяўлены праціўнік – банда мяцежнікаў. Завязаўся бой. Кулямётчык гвардыі радавы Ю. А. Кузняцоў вёў трапны агонь з укрыцця. Праціўнік абстрэльваў групу з ручных процітанкавых гранатамётаў. Адна з гранат разарвалася паблізу пазіцыі Юры і смяротна яго параніла...*

### З пісьма Ю. А. Кузняцова маці і бабулі

9 лютага 1983 г.

*...Вы там не ўздумайце хваляваццa і не слухайце нікога, служба тут такая ж, як і дома, толькі клімат іншы і няма звальненняў.*

*...Вось сёння памыем х/б, а заўтра страявы агляд, будуць аглядаць абмундзіраванне, знешні выгляд і розную дакументацыю. Ты, мама, пішаш пра мастацкую самадзейнасць. Тут яна па некалькі разоў на дні, у сталоўку з песняй, перад адбоем таксама з песняй. Наогул, музыкі хапае.*

*...Я ўжо захваляваўся, чаму ад вас так доўга няма паштовак. Служба мая ідзе пастарому. Толькі цяпер мы будаўнікі. Будуем афіцэрскі інтэрнат, увогуле, працуем, праца не цяжкая, рукі нават стаміліся па нармальнай працы.*

### З пісьма настаўніцы Я. А. Ермачэнка ў рэдакцыю газеты

*...Юра вызначаўся жыццялюбствам, адкрытасцю, сардэчнасцю. Такімі ж былі і яго сябры. З імі можна было размаўляць, як з дарослымі, але з імі было весела, ім быў уласцівы гумар. Сярод іх Юра, на мой погляд, быў любімчыкам, аб гэтым яны мне казалі пасля пахавання Юры: «Ведаеце, Яўгенія Аляксееўна, Юра быў надзейны хлопец, на яго можна было спадзявацца, пайсці з ім у разведку. Ён быў надзейны, выхаваны, чэсны чалавек». І гэта было так.*